# За экстрымам – ва Ушачы!

**Гэта былі самыя экстрэмальныя выхадныя! І з гэтым выказваннем пагадзяцца як удзельнікі, так і балельшчыкі. Чацвёрты фестываль экстрэмальных відаў спорту "Экстрым Прарыў" набыў яшчэ большы маштаб, цікавасць да яго праявіла вялікая колькасць спартсменаў у 11 відах спорту, а гледачамі былі не толькі ўшачане – у гарпасёлак ехалі з розных куткоў нашай краіны. Сімвалічна, што пачынаўся фестываль у дзень 80-годдзя вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На ўрачыстым мітынгу ў гонар гэтай даты кожны падумаў, як добра жыць пад мірным небам, працаваць, адпачываць, займацца спортам. Усклалі кветкі да помніка загінуўшым воінам і партызанам як ушачане, так і ўдзельнікі фестывалю.**


Пераможцы сілавога экстрыму са спонсарамі і арганізатарамі.


340 кілаграмаў узяты!


"Джампінг-плэйс".


Спаборніцтвы па аўтагуку.


Фота з талісманам фестывалю.

## Смелыя не па гадах

Ужо добрая традыцыя пачынаць "Экстрым Прарыў" з выставы спартыўнай аўта- і мотатэхнікі. Некалькі дзясяткаў квадрацыклаў, пазадарожнікаў, ралійных аўтамабіляў – усё гэта можна было разгледзець, памацаць і нават сфатаграфавацца за рулём. Карысталіся такой магчымасцю і малышы, і пенсіянеры. Ну а самымі першымі на старт выйшлі картынгісты. Сёлета заяўкі на ўдзел у картынг-слаламе падалі ажно 70 спартсменаў у некалькіх узроставых катэгорыях: самаму юнаму толькі 7 гадоў. Спаборнічалі і дарослыя. Такая прадстаўнічасць вымусіла расцягнуць гонкі на пляцоўцы ля спарткомплексу на два дні, у суботу да 20 гадзін гледачы назіралі, як лоўка кіруюць картамі і абмінаюць фішкі юныя спартсмены, сярод якіх пераважна мінчане і палачане, але былі і хлопчыкі, якія пераадолелі не адну сотню кіламетраў і прыехалі ва Ушачы з Брэста і Расійскай Федэрацыі.

Упершыню ў праграму фестывалю ўключылі спаборніцтвы па вулічных відах спорту. Удзельнікі не толькі паказвалі спрыт і вызначалі самага лоўкага ў скейтбордынгу, трукавых самакатах, але і з задавальненнем давалі майстар-класы, вучылі ўсіх жадаючых.

## Не шкадуюць шын... і нерваў!

Пра спаборніцтвы на плошчы чутна было на ўсё наваколле: гэту пляцоўку аблюбавалі майстры дрыфту. І калі летась у праграме былі толькі паказальныя выступленні, то сёлета аўтааматары вызначалі, хто з іх самы ўмелы. "Вось гэта крута! Як яны гэта робяць?" – не раз чулася з натоўпу балельшчыкаў, якія не выпускалі з рук тэлефонаў, каб засняць віртуозныя трукі. І нават не засмучаліся, калі ў іх бок ляцеў слуп пылу і дыму! Кожны заезд па розных параметрах ацэньвала журы. Але не толькі высокім адзнакам радаваліся спартсмены, а і эмоцыям, гучным крыкам гледачоў. І здаецца, кожны заезд быў усё больш экстрэмальным. У каротkіх перапынках дзеці прасіліся сфатаграфавацца з гоншчыкамі, а аўтааматары цікавіліся тэхнічным бокам. Уявіце, што шыны падчас дрыфту награваюцца да 100 градусаў і пасля заездаў спартсмены нават астуджаюць іх вадой. Дарэчы, для такіх аўто шыны – самы часты і дарагі расходнік, але ж на што не пойдзеш дзеля экстрыму!

А побач з плошчай на адрэзку па Ленінскай да "Санты" разгарнуліся яшчэ адны гонкі – па джымхане. Некаторыя гледачы зацікавіліся гэтым відам, бо раней нават не ведалі, што гэта азначае. Больш дасведчаныя тлумачылі: трэба праехаць адрэзак за мінімальны час з максімальнай хуткасцю, зразумела, з перашкодамі ў выглядзе конусаў, бочак, умела выкруціць "васьмёрку". Асноўныя навыкі, неабходныя вадзіцелю джымханы – паскарэнне, тармажэнне, манеўраванне, пры гэтым трэба дакладна помніць алгарытм руху і не збіцца. У гэтым відзе заявілася каля 20 удзельнікаў – як на гоначных аўто, так і на звычайных "Джылі" і "Фольксвагенах". Прычым, выязджалі на старт як мужчыны, так і жанчыны. "Прыехалі пахварэць за сваю сяброўку, якая ўдзельнічае ў заездах. З кіраваннем аўто яна спраўляецца выдатна і даказвае, што дзяўчаты могуць руліць не горш, за мужчын!" – падзяліліся мінчанкі Алеся і Наталля Смірновы. Былі на заездзе і непрадбачаныя сітуацыі: напрыклад, "Мэрсэдэс", на які ўсе рабілі стаўкі, віртуозна выкруціўшы "васьмёрку", сышоў з дыстанцыі з-за паломкі.

Вялікую колькасць гледачоў сабрала спецыяльна падрыхтаваная траса з натуральнымі і штучнымі перашкодамі ля спарткомплексу. Апошнія рыхтавалі загадзя – не адзін дзень мясцовыя жыхары з захапленнем сачылі за "ўзвядзеннем" з бярвення, дошак, колаў ад вялікагрузаў розных горак ды трамплінаў. Тут экстрым-праграму прадоўжылі спаборніцтвы па эндура – дысцыпліне мота- і веласпорту, якая прадугледжвае агрэсіўны стыль праходжання бездарожжа. Такія старты Ушачы прымалі ўжо ў другі раз і сёлета колькасць смелых матацыклістаў з розных гарадоў краіны прыкметна павялічылася. "Відовішча не для слабанервовых!" – назіраючы за ліхімі манеўрамі, драматычнымі падзеннямі, казалі некаторыя. І ўсё ж пакідаць глядацкую зону, якая зручна размясцілася на схілах да вадаёмаў насупраць спарткомплексу, ніхто не спяшаўся.

## "Пробкі" на дрыгве

Раніцай у суботу распачынаўся і адкрыты Кубак Беларусі па трофі-рэйдах. Інакш было б немагчыма за дзень правесці два этапы, на першы з якіх адводзілася аж 5 гадзін. Зашмат? Нікольки, калі ўлічыць, што каб дабрацца да першай уліковай кропкі, многім спатрэбілася больш гадзіны. Усяго ж на маршруце іх 15, раскіданых пераважна па балоце. Па сутнасці спаборніцтвы па пераадоленні бездарожжа ўяўлялі сабой спартыўнае арыентаванне на аўтамабілях. Заяўлены праўда, быў толькі УАЗ. Экіпаж Сяргея Козела і Дзяніса Паўлава з Гарадка з'яўляўся і адзіным прадстаўніком Віцебшчыны. "Праходзіць чэмпіянат краіны, зашмат машын ламаецца, таму многія не змаглі прыехаць. А мы завіталі падтрымаць ушачан. Ды і першае месца нам гарантавана", – жартавалі гоншчыкі.

Так, астатнія 16 удзельнікаў праходзілі трасу на квадрацыклах. І вось 8 з іх заселі ў дрыгве ў некалькіх метрах ад запаветнай першай вешкі. Хоць і ўмеюць квадры плаваць, тут гэта не спрацоўвала: выцягвалі на купіны, дапамагаючы адзін аднаму, праходзілі з паўметра хто ўперад, а хто і вяртаючыся назад. А тым часам Валерый Кудравец ужо рабіў заліковае фота. Няўдачу калег ён абярнуў на сваю карысць – не спусціўся за іншымі ў "пробку", а аб'ехаў балота з іншага боку. Не мае значэння і чарговасць праходжання кропак. А вось каб на здымку прысутнічаў унікальны знак – прынцыпова: іх наклеілі на шлемы перад пачаткам спаборніцтваў і папярэдзілі, што без іх заданне не залічыцца.

Хаця ўсе ўдзельнікі гэта ведалі. Не навічкі. Прыгаданы вышэй Валерый – неаднаразовы прызёр чэмпіянату краіны. Дуэт Юрыя Жыліна і Дзмітрыя Васьковіча – абсалютныя пераможцы мінулагодняга "ЭкстрымПрарыву" ў класе багі. Другі раз на фестывалі ўдзельнічае і Віталь Дурэйка, а Ушаччыну нарачанец наогул лічыць сваёй. Прадзед яго сына Цімафея – добра вядомы ў раёне гісторык, работнік райкама партыі Міхаіл Рыгоравіч Казлоўскі.

Калі рушыць па зарасніку ўслед за "квадрамі" жадаючых сярод гледачоў не аказалася, то ўвечары ля спарткомплексу іх было зашмат. Пераадоленне рову, вадаёма – таксама спаборніцтвы, аднак пры гэтым арганізатары нацэльвалі спартсменаў на відовішча. "Глядзі, зараз скакаць будзе", – тлумачыў унуку мінчанін Мікалай Жылін, які аказаўся бацькам мінулагодняга чэмпіёна і дачнікам з нашага Бабовішча. А Юрый сапраўды лёгка пераскочыў роў і сабраў шмат апладысментаў.

## Гоншчыкі з ушацкай "прапіскай"

Наогул на фестывалі было зашмат родных экстрэмалаў, якія суправаджаюць іх на ўсіх спаборніцтвах. Такім чынам усё краіну аб'ехала навапалачанка Жанна Драздова – маці чэмпіёна краіны па картынг-слаламу Дзмітрыя. Васемнаццацігадовы юнак выступае ўжо ў дарослай катэгорыі, а на фестывалі быў яшчэ і трэнерам для малодшых паслядоўнікаў.

Дачную ўшацкую "прапіску", як аказалася, мае і ўдзельнік ралі-спрынту Андрэй Кукушкін. "Яшчэ ўчора прыехаў на "Субару", – паведаміў ураджэнец вёскі Замошша Вялікадолецкага сельсавета Іван Клачок, які на ралі абавязкова бярэ з сабой дзяцей. "Мая бабуля малачком яго паіла", – дадала дачка Івана. Ну а сын угадваў марку машын, як толькі яны пакаваліся на павароце. Сінюю "Субару", праўда, так і не дачакаліся. "Трасу ён ведае выдатна, мабыць, перавысіў хуткасць і занясло дзе", – з веданнем справы казалі мясцовыя мужчыны, літаральна ўсе з правамі, якія назіраюць за спаборніцтвамі з 1987 года. Хапала і жанчын, дзяцей, навапалачанка Вікторыя Пранік з сынам і дачкой прыехала з дачы ў Оснава, на ралі завітала, каб потым прадоўжыць шлях ва Ушачы. Наогул уся моладзь апоўдні аддала перавагу не берагу возера, а ўзгорку, на якім бачны адразу два крутыя павароты. Не абышлося і без кур'ёзаў. Адзін з гледачоў пакінуў кампанію, абраўшы, як палічыў, больш удалую кропку. А вяртаўся пад няспынны смех. Не разлічыў, што якраз на яго пойдуць клубы пылу і нават шлейф пяску з-пад колаў гоначных машын.

## Непрадказальныя асілкі і палымяны джампінг-плэйс

А вось наш асілак Аляксандр Лабань, неаднаразовы пераможца на сваёй, ушацкай тэрыторыі, сёлета ў спаборніцтвах не ўдзельнічаў. Затое выступаў арганізатарам і галоўным суддзёй, ахвотна фатаграфаваўся з землякамі і падбадзёрваў калег. Саша ўжо чацвёрты год збірае турніры па сілавым экстрыме, і на малую радзіму запрасіў прафесіяналаў з Беларусі і Расіі. Сярод іх і самы моцны на сённяшні дзень чалавек краіны Аляксандр Курак з Салігорска, які прадказальна і абышоў чацвярых сапернікаў на "Экстрым-Прарыве". Трэці раз узяў срэбра Яўген Шаўчэнка з Віцебска. Не задаволены бронзавым вынікам аказаўся абсалютны пераможца Маскоўскай вобласці па гэтым відзе Яўген Кліменка: "Тут сабраліся мацнейшыя спартсмены. Што ж, любы вопыт – на карысць".

Дарэчы, падчас паказальных выступленняў ушачане пазнаёміліся і з яшчэ адным новым відам спорту – чырлідзінгам, які спалучае акрабатыку і гімнастыку. Я.Кліменка, зразумела, лёгка падняў на адной руцэ сваю мініяцюрную напарніцу, якая выканала некалькі відовішчных трукаў.

Наогул пяць этапаў выпрабаванняў праходзілі непрадказальна. Адзін спартсмен не змог прайсці 20 метраў з 340-кілаграмовым грузам і адпаведна дабрацца да 400-кілаграмовых шын, а віцябчанін Я.Шаўчэнка ўсё "разлушчыў" за 37 секунд замест адведзенай мінуты. Ён стаў любімцаў многіх гледачоў яшчэ і таму, што па прафесіі – настаўнік гісторыі, у якога аднак рэкорд РБ па станавой цязе (370 кг), і срэбра многіх міжнародных спаборніцтваў. Перанос з пагрузкай рэчаў (вагой 100 і больш кілаграмаў), падняцце аўтамабіля, у які набілася шмат дзяцей, трэк-пул спартыўнага МАЗа.

"Ну што гэта, усяго 10 тон, два гады таму мы 32 цягалі", – падзадорваў удзельнікаў суддзя Аляксандр Кліменка. Ён як ніхто іншы ведаў, што зрушыць з месца і пракаціць 20 метраў за хвіліну – нават складаней, чым цягнуць на канаце. Толькі з паўгода, як ён пачаў пакрыху выступаць, а пра "ЭкстрымПрарыў"-2022 не забудзецца ўжо ніколі: з'явілася "лішняя костка" на назе – тады для яго турнір закончыўся ў карэце "хуткай дапамогі". Лёгкіх відаў у сілавым экстрыме не бывае, як і бутафорскіх элементаў. І Аляксандр Лабань пацвердзіў, што заданні па сілавым экстрыме і ўзровень фестывалю ўсё павышаюцца.

А каб даць адпачыць асілкам і павесяліць публіку – на пляцоўку вынеслі невялікія батуты. Паказальныя выступленні пад энергічную музыку выканала пяцёра абаяльных прадстаўніц полацкага філіяла "Джампінг-плейса", дарэчы, самага прадстаўнічага ў Беларусі. Заняцца такім відам фітнесу адразу захацела і шмат ушачан. Дарэчы, такая магчымасць у іх была. А пасля фестывалю, магчыма, на спарткомплексе з'явіцца і яшчэ адна секцыя.

## Утаймавальнікі воднай стыхіі

У другой палове суботы эпіцэнтр фэсту перамясціўся на Вечалле: у справу ўступілі ўтаймавальнікі воднай стыхіі. На лакацыі, дзе круцілі свае піруэты майстры вейкбордзінгу, спачатку думалі надта доўга не затрымлівацца: від жа для нас звыклы, нічога новага тут не ўбачыш. Але на водна-аднаўленчай станцыі панавала такая кайфовая атмасфера... І нават смачныя бясплатныя кактэйлі давалі – такі падарунак гасцям робіць штораз сталічны магазін тавараў для актыўнага адпачынку "Стыхія", які падтрымлівае маладыя таленты ў экстрэмальным спорце. Чарговы ж этап Кубка Беларусі аказаўся захапляльным, на яго прыбылі амаль усе фаварыты, а галоўнае – ушачанам тут было за каго пахварэць. У мацнейшых катэгорыях бой лідарам давалі Антон Латышаў, Дзмітрый Шаўчэнка і Максім Рындзёнак (4, 6 і 7 месцы адпаведна), аматарскую закрылі Дзмітрый Журко і Мікіта Кірпічонак – у выніку першы заваяваў "золата", а другі паказаў 4-ты вынік. У жаночай змагалася Крысціна Корабава: у гэтым спорце яна фактычна навічок, але з хваляваннем справілася. Ну а ў ветэранскай выступаў сам Сяргей Фамін – і таксама ўзышоў на вышэйшую прыступку п'едэстала! У праграму быў уключаны і камандны залік, у якім ушацкі клуб атрымаў "срэбра", прапусціўшы ўперад гомельскіх сяброў. "Трэба сказаць, што ўзровень выступленняў апошнім часам прыкметна вырас і праграмы аматараў па складанасці не саступаюць тым, з якімі майстры мінулых год атрымлівалі медалі. А вы б бачылі, якое задняе сальта з трубы выкруціў адзінаццацігадовы Ігнат Шылкін!" – зазначыў Сяргей Васільевіч. Вядома ж, мы пазнаёміліся з юным вейкбардзістам, які патлумачыў, што гэты элемент раней ніколі не выконваў, але вырашыў рызыкнуць – і зрабіў дарослы бэкрол! Дарэчы, імкненне стаць лепшым у хлопчыка дакладна ад таты: Дзмітрый Шылкін – дзевяціразовы чэмпіён Рэспублікі Беларусь па... боўлінгу, а ў свой час нават выступаў на сусветным чэмпіянаце ў Лас-Вегасе. "Эх, шкада, што няма майго віду ў праграме фестывалю!" – жартам скардзіўся мінчанін.

Тым часам па возеры пайшлі хвалі – на дыстанцыю выехалі прадстаўнікі водна-маторнага спорту. Летась ён быў прадстаўлены толькі гідрацыкламі, зараз жа апроч аквабайкаў двух відаў спаборнічалі і маталодкі. Аляксей Василенка з Санкт-Пецярбурга, Мікалай Іваноў з Падмаскоўя і беларус Аляксей Галаўкоў стралой імчалі па азёрным люстры, закладаючы крутыя віражы. А колькі кампліментаў Вечаллю адпусцілі пасля фінішу – маўляў, і вада ў ім мяккая, і берагі пакатыя... лепшага месца для водных гонак і не прыдумаеш.

## А музыка гучыць!..

Яшчэ адным фестывальным дэбютам сталі спаборніцтвы па аўтагуку. "Цікава, што гэта такое? Мабыць, вадзіцелі будуць цiснуць на клаксон і высвятляць, у каго ён самы пранізлівы?" – прачытаўшы праграму, разважалі некаторыя ўшачане. Насамрэч жа гэты турнір мае на мэце высветліць, чыя аўдыёсістэма найбольш гучна і якасна трансліруе музыку і найлепш інсталявана. Спецыяльныя вымяральнікі вызначаюць узровень гукавога ціску – гэты паказчык уплывае на вынік. Вось што расказаў нам на гэты конт шумілінскі ўдзельнік Іван Ліпскі: "Якая дарога без музыкі? Усіх нас аб'ядноўвае жаданне мець у аўто нешта большае, чым проста магнітола і дзве калонкі. Дарэчы, дастойная сістэма абыходзіцца амаль у палову кошту самой машыны, але для любімага захаплення нічога не шкада. Затое там, дзе маё аўто – заўсёды весела! Можна арганізаваць шоу з дыскатэкай за горадам, ці на такім вось прыгожым пляжы, як ваш!".

Калі ж размова зайшла пра музыку, то варта зазначыць, што вячэрнія канцэрты многія гледачы лічаць не бонусам, а асноўным пунктам праграмы. У гэтым сэнсе адзначым яшчэ адзін фестывальны дэбют: сёлета хэдлайнерам фестывалю стала знакамітая група "Отпетые мошенники". Піцерскія хлопцы не расчаравалі, выканаўшы ўсе галоўныя хіты. Знайшоў сваіх прыхільнікаў і айчынны гурт "ПараЛель", які пабудаваў праграму на каверах "Караля і шута". "Я проста ў захапленні, узяла ў музыкантаў аўтографы, гэта лепшы вечар!!" – падзялілася з намі эмоцыямі юная палачанка Саша Шкодзіна, якая прыехала на фестываль з мамай. Яркага экстрыму дадало гэтаму вечару і эфектнае вогненнае шоу.

## Рэкардсмены па кубках і ўражаннях

На кожным падобным мерапрыемстве ладзяцца ўрачыстыя цырымоніі. Падчас адкрыцця старшыня Ушацкага райвыканкама Сяргей Садоўскі прывітаў усіх гасцей на нашай зямлі, а ганаровае права ўзняць дзяржаўны сцяг атрымаў лепшы аўтагоншчык Беларусі, капітан каманды "МАЗ-СПОРТаўта" Сяргей Вязовіч, а таксама каманда юных самбістак Ушацкай СДЮШАР, якая стала сёлета бронзавым прызёрам першынства краіны. Дарэчы, сямейны экіпаж Вязовічаў зноў стаў лепшым у абсалютным заліку ралі-спрынту, а сам гоншчык разам з калегамі адразу адправіўся на прэстыжны міжнародны марафон "Шаўковы шлях".

Працяглай атрымалася цырымонія закрыцця, што і нядзіўна, бо трэба было ўручыць 36 камплектаў узнагарод, амаль паўтары сотні кубкаў!

Традыцыйна шмат добрых слоў было выказана ў адрас арганізатараў. Прадстаўнікі спаборніцтваў па джымхане ўручылі Падзякі Ушацкаму райвыканкаму, сектару спорту і турызму і раённаму аддзяленню ДАІ за выдатную арганізацыю мерапрыемства. У сваю чаргу С.Садоўскі адзначыў такім жа чынам дырэктара Беларускай аўтамабільнай федэрацыі Аляксандра Зайцава за супрацоўніцтва і дапамогу ў правядзенні фестывалю. Прагучалі словы ўдзячнасці ў адрас усіх службаў, якія былі ў ім задзейнічаны, узнагароды атрымалі і валанцёры. І, канечне, не было б гэтага свята без спонсарскай падтрымкі.

Шчыра прызнаемся, за два дні мы пазнаёміліся з вялікай колькасцю людзей і не пачулі ніводнага нават стрыманага водгуку – адны кампліменты! А самым сціплым у ацэнцы аказаўся... галоўны куратар экстрэмальнага свята – загадчык сектара спорту і турызму райвыканкама Сяргей Ціханёнак: "Усё было дастойна, але можна зрабіць яшчэ лепш". Што ж, для гэтага будзе магчымасць у наступным годзе, калі наш фестываль адсвяткуе свой першы юбілей.

**Вольга КАМАРКОВА, Вольга КАРАЛЕНКА, Наталля БАГДАНОВІЧ.**

**БОЛЬШ ФОТА – НА НАШЫМ САЙЦЕ.**

◆ **Сяргей САДОЎСКІ:**

*"Можна канстатаваць, што сёлетні фестываль атрымаўся ўдалым, сабраў вялікую колькасць гасцей і ўдзельнікаў. Прыемна, што ў некалькіх відах праграмы выступалі і нашы сябры-суседзі з Расійскай Федэрацыі. Многія госці прызнаваліся, што раней не ведалі пра Ушачы, а зараз мараць прыехаць да нас і ў наступным годзе. А значыць, мы робім годную справу!"*


На пляцоўцы картынг-слалама.


На трасе эндура.


Экіпаж Вязовічаў з ушацкімі самбісткамі.


Спаборнічаюць дрыфтэры.


Трасу праходзіць А.Латышаў.